**Галіна Флікоп**

# Асаблівасці тэрміналогіі пры апісанні іканастасаў у візітацыйных актах уніяцкіх храмаў Беларусі ў канцы ХУІІ – першай трэцмі ХІХ ст.

У статті розглянуто особливості опису іконостасів і використання спеціальної термінології для їх визначення у протоколах перевірок уніатських храмів Білорусі в кінці XVII – початку XIX століть. Дослідження побудовано на узагальнені відомостей із низки історичних документів, які відображають стан близько 2000 греко-католицьких церков. Найцікавіші приклади з архівних джерел уміщено у статті мовою оригіналу зі збереженням тогочасного правопису.
*Ключові слова*: уніатська церква, іконостас, архівні джерела, протоколи візитацій, інтер'єри храмів, термінологія

Адным з цікавых і мала даследаваных аспектаў гісторыі і функцыянавання ўніяцкай царквы з'яўляецца пытанне абсталявання сакральных інтэр'ераў. Яму мы прысвяцілі некалькі нашых артыкулаў, у якіх асвятляўся стан грэка-каталіцкіх храмаў у канцы XVII – пачатку XIX стст.[1] Даследаванне праводзілася пры вывучэнні гістарычных дакументаў, а менавіта – пратаколаў візітацый, у якіх падрабязна занатаваны звесткі пра інтэр'ер царквы, яе начынне, парафію, плябанію, святара і інш. Аднак трэба падкрэсліць, што праца з гэтымі крыніцамі вымагае не толькі руплівасці і ўважлівасці (паколькі дакументы напісаны польскай мовай з лацінскімі і царкоўнаславянскімі ўстаўкамі і даволі часта – не вельмі разборлівым почыркам), а і адпаведных навыкаў.

Справа ў тым, што логіка тагачасных візітатараў, якія і ажыццяўлялі гэтыя праверкі, адрозніваецца ад сучаснай. Некаторыя вядомыя нам цяпер тэрміны ў тыя часы ўжываліся ў іншым значэнні. А гэта можа прывесці да прынцыповых памылак. Асабліва гэта актуальна пры даследаванні іканастасаў. Як будзе паказана ніжэй, у гістарычных крыніцах XVII–XIX стст. гэтая сакральная канструкцыя магла апісвацца па-рознаму, з выкарыстаннем розных найменняў і характарыстык. Для абагульнення і сістэматызацыі такія звесткі прадстаўляюць складанасць. У дадзеным артыкуле будуць паказаны асаблівасці апісання іканастасаў візітатарамі грэка-каталіцкіх цэркваў з 1680-х гг. – часу, да якога належаць найбольш раннія захаваныя дакументы, да 1830-х гг. – моманту скасавання канфесіі.

Пад час даследавання намі былі апрацаваны дакументы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродна, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (далей – ЛДГА), Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта, Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (далей – РДГА), Дзяржаўнага архіва ў Любліне (далей – ДАЛ). Крыніцы асвятляюць стан сямідзесяці грэка-каталіцкіх дэканатаў, што складае каля 2000 храмаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі і памежных з ёй рэгіёнаў, размешчаных цяпер у Расіі (Смаленшчына), Польшчы (Падляшша), Літве (Віленшчына).

У дакументах у значэнні «іканастас», як правіла, ужывалася слова «deijsus» (толькі ў некаторых крыніцах канца XVIII – пачатку XIX ст. пішацца «jkonostas», «konostas», «okonostas»). Цікавыя выразы прысутнічаюць у некаторых актах. Так, пры апісанні царквы ў мястэчку Лахва Клецкага дэканату ў 1784 г. правяраючы адзначае: «Deisus, czyli Jkonostas z roznych obrazow Swiętych zrobiony»[2]. У дадзеным выпадку візітатар вырашыў зрабіць удакладненне і падкрэсліў сінанімічнасць тэрмінаў. Хаця, безумоўна, слова «deijsus» ужываецца ў большасці выпадкаў.

Неабходна адзначыць, што пры наяўнасці або адсутнасці іканастаса далёка не заўсёды ў пратаколе праверкі рабіўся адпаведны запіс. Такія падрабязныя звесткі, як напрыклад пры апісанні Троіцкай блонскай царквы аднайменнага дэканату ў 1783 г. «Deisus cały z Apostołami y Ewangelistami malowany z sywerskimi drzwiami, na srzodku Carskich drzwi Obraz Spasytela z koroną...»[3], прысутнічаюць далёка не заўсёды. Часам пра наяўнасць іканастастаса ў храме можна здагадацца толькі па ўскосных сведчаннях (пра гэта размова пойдзе ніжэй).

Неабходна адзначыць, што і пры адсутнасці «deijsusa» адпаведны запіс рабіўся даволі рэдка. Калі іканастаса ў храме не было, дык ён у пратаколах праверак па просту не згадваўся зусім. Выключэннем толькі могуць з'яўляцца некаторыя візітацыйныя акты з найбольш ранніх дайшоўшых да нас: 1680–1682 гг.[4] і 1754 г., калі яшчэ ва ўніяцтве даволі моцнай была памяць пра яго першапачатковую грэчаскую абрадавасць[5]; і з найбольш позніх – 1822 г. (Лепельскі, Смалянскі, Аршанскі, Бабыніцкі дэканаты)[6], дзе апісанні былі вельмі падрабязнымі і фіксаваліся ўсе асаблівасці абсталявання сакральнага інтэр'еру.

Але не заўсёды ў дакументах прысутнічалі такія адназначныя звесткі. Асабліва гэта датычыцца тых храмаў, дзе «deijsus» меў толькі адзін чын – мясцовы. Пра наяўнасць іканастаса ў такіх цэрквах можна меркаваць пры

згадванні Царскай Брамы (часам і дыяканскіх дзвярэй) і абразоў ніжняга яруса. Так, у Мікалаеўскай царкве в. Казіміраўка Глускага дэканату 1791 г. «Carskie Drzwi nad ktoremi Pan Jezus z 4a Apostołami z obuch stron tych...»[7], а ў гарадзейскім храме Цырынскага дэканату ў 1793 г. «Przed Wielkim ołtarzem Drzwie Carskie, podwoyne, po bokach Drzwiczki małe...»[8].

Цікавая асаблівасць апісання такіх канструкцый прысутнічае ў дакуменце 1732–1736 гг., дзе прадстаўлены звесткі пра сотню храмаў усходняй Беларусі. Там у значнай колькасці візітацыйных актаў адзначаецца, што Царская Брама знаходзіцца ў галоўным алтары: «Ołtarz Wielki z Carskiemi Drzwiami»[9]. Але ў некаторых апісаннях гаворка ідзе непасрэдна пра іканастасы. Напрыклад, у днесінскім храме знаходзіўся «Deisus na 12 tablicach malowany z wyrażeniem 12 Apostalow y 12 Prorokow, Pana Jezusa y Nayswiętszey Panny»[10]. Па ўсёй верагоднасці, такая розніца ў выкарыстанні тэрмінаў тлумачыцца асаблівасцямі самой канструкцыі, якая і апісвалася візітатарамі: калі гэта быў аднаярусны іканастас, дык у дакументах ён фіксаваўся як «галоўны алтар з Царскай Брамай», калі чыноў было некалькі, дык тады выкарыстоўваўся тэрмін «Deisus», але трэба падкрэсліць, што ён характарызаваў менавіта верхнія чыны, мясцовы ж з абразамі і дзвярыма фігураваў пад выразам «Ołtarz Wielki».

Такім чынам складваецца ўражанне, быццам іканастас размяшчаўся ўверсе над галоўным алтаром. Сучаснаму чалавеку ўявіць такую канструкцыю даволі складана, бо пад абодвума тэрмінамі адразу ж усплываюць і адпаведныя вобразы. А ў тыя часы «іканастасам» называліся пэўныя рады абразоў, змешчаныя над Царскай Брамай і мясцовымі іконамі.

Падобныя апісанні прысутнічаюць і ў больш позніх дакументах – візітацыйных актах Чашніцкага і Аршанскага дэканатаў за 1822 г. Там, да прыкладу, пры апісанні храма ў в. Чарняўка (Аршанскі дэканат) адносна галоўнага алтара адзначаецца, што ён «używa się za jkonostas, ma około drzwi sewernych dwoie...»[11].

Часам пра наяўнасць іканастаса ў храме (пры адсутнасці дакладных упамінанняў) сведчаць апісанні не толькі Брамаў, пра што вялася размова вышэй, а і ікон, размешчаных побач з імі. У большасці выпадкаў для іх прысутнічала азначэнне «namiesne» (напрыклад, у візіце 1773 г. прылуцкай царквы Брэсцкага дэканату адзначаецца: «...obrazów namiesnych wszystkich 5...»[12]), аднак часам такая характарыстыка апускалася, але з кантэксту з’яўляецца зразумелым, што гаворка вядзецца менавіта пра абразы мясцовага чыну. А гэта, у сваю чаргу, сведчыць пра наяўнасць у храме іканастаса. Напрыклад, у візіце 1759 г. храма вёскі Даўголіска Уладаўскага

дэканату адзначаецца «Dzwi Carski... wedle ktorych z jednej strony obraz Troycy S.... po lewey – Nays. Panny...»[13].

Варта сказаць пра выкарыстанне ў пратаколах яшчэ аднаго тэрміна, датычнага ніжняга чыну іканастаса – «ołtarze namiesne» (мясцовыя алтары). Выраз адлюстроўвае цікавую з'яву, якая мела месца выключна ў грэка-каталіцкіх храмах. Так бы мовіць, новы прынцып арганізацыі сакральнай прасторы, утвораны на спалучэнні праваслаўных і каталіцкіх традыцый. «Мясцовыя алтары» з'яўляюцца ні чым іншым, як іканастаснымі абразамі ніжняга чыну з падстаўленымі да іх менсамі і/або пераабсталяванымі з дапамогай дадатковых рамаў, слупкоў і іншых у алтары. У літургічным плане яны, па ўсёй верагоднасці, выконвалі функцыю звычайных «класічных» бакавых алтароў. Цікава, што пры з'яўленні «ołtarzow namiesnych» захоўваліся і іканастасныя брамы.

Пры чым гэтая з'ява стала настолькі натуральнай і арганічнай, што нават пры стварэнні і ўладкаванні ў храме новых іканастасаў, яны адразу ж праектавалася з «мясцовымі алтарамі». Напрыклад, у язвінскай царкве Мазырскага дэканату ў 1800 г. знаходзіўся «Deisus stolarskiey roboty z snycerskim rznięciem dla namiesnych dwoch ołtarzow...»[14]. Менавіта як частка новага іканастаса алтар апісваецца ў актах гарадзецкай царквы Быхаўскага дэканату ў 1822 г[15]. Пра «Ołtarzy w ikonostasie» (без удакладнення «мясцовыя») вядзецца гаворка ў пратаколах праверак абчужскай царквы Чарэйскага дэканату за 1822 г.[16] і некаторых іншых храмаў Полацкай епархіі ў пачатку XIX ст.

Пра тое, што менсы пад абразамі ніжняга чыну ўспрымаліся як арганічная і неад'емная частка іканастаса сведчыць тая акалічнасць, што пры іх адсутнасці ў пратаколах даволі часта рабіўся адпаведны запіс. Напрыклад, у антонаўскім і дзямідавіцкім храмах Петрыкаўскага дэканату ў 1787 г. былі адпаведна «ikonostas wspaniały z pierwszy kondygnacyi ale bez mens» і «obrazy namiestne Spasytela y Nayswiętszey Panny bez należnych mens...»[17]. У апошнім выпадку сам выраз «належныя менсы» з'яўляецца пацверджаннем выказанай думкі. Цікавы і той факт, што прыведзеныя тут прыклады датычацца Тураўскай епархіі, дзе грэчаскі тып абсталявання ў большасці храмаў захоўваўся ажно да моманту скасавання Уніі ў XIX ст. Аднак, як бачна, у сакральным інтэр'еры на хвалі лацінізацыі трывала ўкараніліся новыя элементы, якія сталі яго арганічнай і натуральнай часткай.

Але найбольшыя складанасці выклікалі такія звесткі, калі ў дакуменце адзначалася, што іканастаса няма, але пры гэтым апісваліся «мясцовыя алтары» і Царская або/і дыяканскія брамы. Паўставала пытанне, ці лічыць такую структуру іканастасам, ці не. Так, пры апісанні макранскай царквы

Быхаўскага дэканату ў 1822 г. адзначаецца, што іканастаса няма. Але такі запіс зроблены, напэўна, па той прычыне, што ён быў некананічны. Інакш кажучы, канструкцыя, якая аддзяляла прэсбітэрый ад асноўнага аб'ёму храма складася з разнастайных абразоў, якія, па ўсёй верагоднасці, не былі сфармаваны ў адпаведныя чыны. Таму візітатар і зрабіў запіс: «Ikonostasu formalnego niema, lecz takowy ułczony iest z róznych obrazow ktorych liczba 15cie nad ktoremi obraz ukrzyżowanego Zbawicela na gladkim drzewi malowany, między zas namiestnemi obrazami Drzwi Carskie snicerskiey roboty hotowe z Horodzieckiey Cerkwi nabyte...»[18].

У дакуменце за 1759 г. у пратаколах рагозенскай, віжацкай і таўлянскай цэркваў Кобрынскага дэканату адзначана: «dejsusu formalnego niema...», аднак пры гэтым для першых дзвюх падкрэсліваецца наяўнасць Царскай Брамы, апісваюцца абразы побач і над ёй[19]. Для абагульнення гэтыя дадзеныя прадстаўляюць складанасць, бо, з аднаго боку, у саміх жа крыніцах адзначана адстутнасць «фармальнага» іканастаса, але з другога боку, апісанне брамаў і ікон супярэчыць гэтаму.

Але тут дапаможа разуменне логікі візітатара, паводле якой іканастасам з'яўлялася тая канструкцыя, якая знаходзілася ўверсе(!) над брамамі і мясцовымі абразамі, а яны, у сваю чаргу, ў яго не ўваходзілі. Таму запіс, што «фармальнага іканастаса няма» сведчыць пра тое, што няма ніякай канструкцыі ўверсе, але пры гэтым маглі быць ніжнія абразы і брамы (які, дарэчы, і апісваюцца ў дакументах) — тое, што мы называем мясцовым чынам. І калі толькі яны і мелiся, то гаворка ідзе пра аднаярусны іканастас.

Так, у царкве Апекі Маці Божай у в. Зазер'е Ігуменскага дэканату ў 1792 г. «Carskie drzwi stolarskiey roboty z wyrzynaniem malowane, przy których obrazow dwa na tablicach Nayswiętszey Maryi Panny y Spasytela... *w gorze Deisus* y inne obrazy»[20]. Аналагічных запісаў у пратаколах фігуруе вельмі шмат: у Троіцкім храме в. Марозавічы Навагрудскага дэканату ў 1754 г. «Deisus z obrazami SS. Apostołow y Prorokow na drzewie malowany. *Pod Deisusem Carskie Drzwi* malowane stolarskiey roboty y pobokach Drzwi siwirskie ...»[21].

Яшчэ адно апісанне, нават з падрабязным пералікам іканастасных чыноў, сярод якіх мясцовы не быў улічаны, знаходзіцца ў пратаколе рэчыцкай царквы Глускага дэканату за 1792 г. «Jkonostas we trzy kondygnacye, nad nim Pan Jezus Ukrzyżowany z czterma osobkami na drzewie malowany, w wyzszey kondygnacyi płaszczennica, obok obrazy Prorokow, w sredniey Spasytela, obapoł Apostołow, w dolney Wieczerzy Panskiey, obapoł – Prazdniczne, pod niemi obrazow namiesnych pięć»[22]. З гэтага запісу вынікае, што

іканастас складаўся з трох чыноў, ніжэйшым з якіх быў святочны, а вось пад ім і знаходзіўся мясцовы рад, які, паводле меркавання правяраючага, у склад іканастаса не ўваходзіў. Прыведзеныя тут прыклады выразна ілюструюць логіку візітатараў, на думку якіх, яшчэ раз падкрэслім, іканастасам лічылася канструкцыя над Царскай Брамай, дыяканскімі дзвярыма і мясцовымі абразамі.

У дакументах пачатку XIX ст. ёсць і адваротныя прыклады: там іканастасам названы ніжні(-я) чыны, а верхні – характарызуецца, як «абразы над іканастасам». Такое апісанне, па ўсёй верагоднасці, абумоўлена не меркаваннямі правяраючага, як у папярэдніх выпадках, а асаблівасцямі самой канструкцыі. Іканастасам быў названы пэўны архітэктурны твор з разьбянымі аздобамі, калонамі, перагародкамі і спецыяльнымі месцамі для абразоў. Ён усталёўваўся паміж асноўным аб'ёмам храма і прэсбітэрам, там, дзе яму і належыць быць, аднак, верагодна, займаў не ўсю вышыню. А ўверсе над ім, напэўна, прымацаваныя да бэлек, на якія насцілалася столя, змяшчаліся іконы верхніх чыноў. Паколькі ў саму архітэктурную канструкцыю яны не ўваходзілі, дык візітатары пры апісанні і фіксавалі іх як «абразы над іканастасам».

Так, у візіце глазоміцкай царквы Веляшкоўскага дэканату за 1822 г. адзначаецца «Jkonostas o jedney kondygnacij... z Carskiemi y Siwernemi Drzwiami z namiesnemi obrazami... nad toy kondygnacią cztery obrazy w Blutach rzniętych mające w sobie Dwonustu Apostołow a piąty także obraz Zmartwychwstania Panskiego a pod nim wyobrażenie Taynoy Wieczery»[23]. Маецца і яшчэ адзін падобны прыклад: у 1822 г. у Пятрапаўлаўскай бешанковіцкай царкве «w samym okonostasie obrazow dwanascie, posrodku 12 apostołow, w wierzszku samym 12 Prorokow»[24]. Атрымліваецца, што ў самім іканастасе было толькі 12 абразоў, а астатнія 24 (Апосталы і Прарокі) знаходзіліся над ім.

Такім чынам, абразы Апосталаў, размешчаныя ўверсе, на думку правяраючага, знаходзіліся над адзіным іканастасным чынам. І калі ў дакументах XVIII ст. выразна прасочваецца агульнасць у тлумачэнні «deijsusu», які быццам бы ўключаў у свой склад толькі тыя чыны, якія знаходзіліся над мясцовымі абразамі і брамамі; дык у XIX ст. такой агульнай логікі не назіраецца.

У большасці дакументаў гэтага часу (XIX ст.) даецца, як ужо адзначалася, вельмі дакладнае апісанне, якое цалкам адпавядае сучаснаму разуменню і тэрміналогіі. Аднак у актах некаторых храмаў прысутнічаюць супярэчлівыя звесткі. Да ліку іх належыць і прыведзены вышэй прыклад пра глазоміцкую царкву. У нечым падобная сітуацыя назіраецца ў пратаколах праверак двух храмаў Цяцерынскага дэканату за 1822 г. Пры чым у абодвух выпадках

блытаніна ўзнікла менавіта пры апісанні святочнага раду іканастаса, а дакладней, як асобны чын ён увогуле не быў ўлічаны. Так, у пратаколе Мікалаеўскай цяцерынскай царквы адзначаецца, што іканастас быў двух'ярусны: пры апісанні першага згадваюцца мясцовыя абразы, Царская Брама і двое дыяканскіх дзвярэй; а пры апісанні другога – 12 Апосталаў і 12 Святаў. Можна выказаць здагадку, што ўсе гэтыя 24 іконы і сапраўды знаходзіліся ў агульным шэрагу, аднак больш падрабязнае апісанне іншай царквы з аналагічнай сітуацыяй уносіць пэўнае тлумачэнне.

Гэта датычыцца шапялевіцкай царквы, дзе іканастас згадваецца як трох'ярусны, але яго падрабязнае апісанне сведчыць пра тое, што ён складаўся з 4 чыноў: мясцовага, святочнага, апостальскага, прарочага. Пры чым і ў гэтым выпадку не быў улічаны менавіта святочны рад у агульную колькасць. А яго размяшчэнне адзначана наступным чынам: «W drugiey (kondygnacyi. – Ф. Г.) nad Carskiemi Drzwiami obraz Zbawicela... po bokach 12 Apostołow, a w dole pod niemi 12 Uroczystych Prazdnikow malowanych. W trzeciey... 12 Prorokow»[25]. Пры чым першым чынам названы мясцовы. Атрымліваецца, што паміж першым мясцовым і другім апостальскім ярусамі знаходзіліся 12 абразоў святочнага цыклу. Не зразумела, чаму візітатар не палічыў гэта за асобны чын, але, па ўсёй верагоднасці, менавіта гэтак жа святочныя іконы размяшчаліся і ў іканастасе цяцерынскай царквы, дзе было не 2, як зафіксавана ў дакуменце, а 3 ярусы.

У адным з дакументаў тэрмін «deijsus» выкарыстоўваўся ў значэнні не «іканастас», а «чын»: ў царкве Малых Шчытнікаў Брэсцкага дэканату ў 1773 г. «Deisus Apostołski na drzewie malowany, jtem Deisus Prorocki na płotnie malowany, jtem Prazniczny Deisus na drzewie malowany, wszystkie obrazy staroswieckiey piktury»[26]. Відавочна, што гаворка ідзе не пра тры іканастасы ў адным храме, а пра іканастасныя ярусы, якія, ў дадзеным выпадку былі напісаны на розных асновах: другі і чацвёрты (апостальскі і святочны адпаведна) на дрэве, трэці (прарочы) – на палатне.

Вядомы таксама і выпадкі, калі слова «Deisus» выкарыстоўвалася для характарыстыкі абраза пэўнай іканаграфіі. Менавіта ў такім значэнні гэты тэрмін і выкарыстоўваецца зараз у сучасным мастацтвазнаўстве. «Дэісусам» завецца ікона з выявай Хрыста, а таксама Марыі і Яна, якія схілены да яго ў маленні. Таксама «дэісусам» можа быць названы іканастасны чын з некалькіх абразоў, якія таксама прадстаўляюць сцэну малення перад Хрыстом некалькі Святымі.

Так, у візітацыйных актах у гэтым значэнні названы тэрмін быў выкарыстаны пры апісанні Браслаўскага дэканату ў 1789 г. У друйскай

царкве «Konostas z Carskiemi Wratami, dwoje sywernemi drwiami. Obrazow namiestnych 4, to jest zaczowszy od prawey strony obraz Premienienia Panskiego, 2gi Spasytela, 3 Nayswiętszey Panny, 4 Mikołaja. <...> W drugiey kondygnacyi Obrazow 7: SS Apostołow, a siodmy Deisus, nad temi obrazy małe SS. Patryarchow i Prorokow...»[27]

Акрамя вышэй названых тагачасных асаблівасцяў апісанняў «deijsusu», былі свае нюансы і ў падачы звестак пра асобныя яго абразы. Гэта датычыцца ікон ніжняга раду, якія, у сучасным разуменні, могуць быць названы агульным тэрмінам – «мясцовы чын» або «мясцовыя іконы». Аднак, зноў жа, і тут у XVIII–XIX стст. назіраліся свае асаблівасці. Безумоўна, гэта мела не татальны характар, а фігуравала толькі ў некаторых дакументах. Тым не менш, і выпадковымі гэтыя запісы таксама не назавеш. Так, у візіце 1822 г. храма в. Пенкнавічы Веляшкоўскага дэканату прысутнічае такое апісанне: «W pierwszey kondygnacyi przy namiestnych obrazach obraz S. Jana Krzciciela»[28]. У іншых дакументах (збольшага пры апісанні Полацкай Епархіі ў 1822 г.) даволі часта можна сустрэць прыклады, калі «мясцовымі» абразамі іканастаса названы толькі два з іх – іконы Маці Божай і Хрыста, якія змяшчаліся непасрэдна побач з Царскай Брамай. Астатнія ж творы ніжняга яруса былі названы «бакавымі».

На месцы іканастаса ў некаторых храмах знаходзіліся іншыя канструкцыі. Так, у пружанскай царкве Святой Параскевы «...idzie struktura wsciąż od sciany do sciany zamiast deijsusa»[29]. Прычым, што за «структура» з пратаколу не зразумела, аднак там адзначана, што яна «nowa stolarskiey pięknеy roboty ieszcze nie malowana», і ў ёй знаходзяцца двое дыяканскіх дзвярэй, а таксама яшчэ не скончаная Царская Брама. Наяўнасць брамаў і дазваляе сцвярджаць, што гаворка ідзе пра іканастас, бо, па ўсёй верагоднасці, выконвалася яго літургічная роля. А тое, што дадзеная структура была новай, дае магчымасць выказаць здагадку, што яна была як раз прызначана для размяшчэння на ёй абразоў (і фарміравання іканастаса), якія на момант візітацыі яшчэ не былі ўсталяваны.

Аднак верагодна, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе пра алтарную агароджу – з'яву, якая ўзнікла ў рэчышчы Уніі і была ўласціва храмам выключна гэтай канфесіі. Такія канструкцыі па цяперашні час захаваліся ў мураваных цэрквах, якія, пераважна, былі пры базыльянскіх кляштарах. Аднак з візітацыйных актаў вынікае, што значная колькасць драўляных храмаў Навагрудскага (25%) у 1754 г., Пружанскага (45%) і Камянецкага (25%) дэканатаў у 1759 г. была з агароджамі.

Звесткі пра царкву Узвядзення Крыжа паміж в. Ліноўцы і Аранчыцы дазваляюць сцвярджаць, што і сапраўды такога роду агароджы выконвалі

функцыю іканастаса: «deijsusa niema. Tylko na tych miast kratka z drzwiczkami po srodku ten ołtarz wielki przedzielaiąca...»[30]. Падобныя дадзеныя прысутнічаюць ў візітацыйных актах 1822 г. скрылаўскай царквы Задзвінска-Бешанковіцкага дэканату «przy tym ołtarzu miasto Jkonostasa przegrodzone prezbiteriem qradkami»[31]. Такое апісанне з'яўляецца больш дакладным, чым ва ўсіх прыведзеных вышэй выпадках, паколькі пазначана функцыя гэтай агароджы. Яна была прызначана, каб аддзяліць прэсбітэрый ад агульнага інтэр'еру храма, а значыць у літургічным сэнсе выконвала такую ж ролю, як і іканастас.

Пры чым гэтая з'ява мела лакальны характар. І калі цэрквы з іканастасамі складалі 45% ад усіх храмаў Пружанскага дэканату, то амаль такая ж колькасць была з агароджамі. Напрыклад, у пружанскай царкве Святога Спаса «za deijsus ... sluzą balki drewniane prostey rîbîty»; тое ж самае сказана і пра блудзенскую царкву Святога Мікалая; у царкве Узвядзення Крыжа в. Равяцічы «zamiast deijsusu idą kratki drewniane prostey roboty». Часам канструкцыя крыху ўскладнялася: у мураўскай царкве Святых Кузьмы і Дзям'яна «zamiast deijsusu kratki drewniane w dole prostey roboty, a w gorze na balku krzyz...»[32].

Такім чынам, праведзены падрабязны разгляд тэрміналогіі візітацыйных актаў дазволіць пазбегнуць прынцыповых памылак у некалькіх пытаннях: наяўнасці/ адсутнасці ў храме іканастаса, канструкцыі (колькасць чыноў) апошняга, абразоў у яго складзе. Разуменне логікі візітатараў XVII – пачатку і XIX стст. і асаблівасцяў апісанняў грэка-каталіцкіх храмаў дасць магчымасць больш дакладна уявіць выгляд нутраной прасторы храма, вызначыць найбольш тыповы прынцып арганізацыі сакральнага інтэр'еру, прасачыць заканамернасці ў яго станаўленні, фармаванні або пераўтварэнні.

[1] Флікоп, Г. А. Існаванне іканастасаў у грэка-каталіцкай царкве ў XVII – першай палове XIX ст. / Г. А. Флікоп // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2013. – № 4. – Мн.: Беларуская навука, 2013 г. – С. 81–87.

[2] НГАБ. – Ф. 3245. – Воп. 7. – Спр. 3. – [Візіты Клецкага і Нясвіжскага дэканатаў]. – 1784. – [192] арк.

[3] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41285. – Protokolon seu acta canonice Visitationis Eccesiarum... – 1783. – Арк. 30 адг.

[4] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 42042. Візіты ўніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага Сабораў. – 1680–1682 гг. НГАБ. – Ф. 1502. – Воп. 1. – Спр. 13. – [Візіты Навагрудскага дэканата]. – 1754. – [60] арк.

[5] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 178. Wizyty dekanatu i protopresbyteryi Bobynickiey za 1822 rok. – 1822. – [110] арк.; – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 181. Wizyty dekanatu Lepelskiego za 1822 rok. – 1822. – [68] арк. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 185. Wizyty dekanatu Smolacskiego i Orszacskiego za 1822 rok. – 1822. – [95] арк.

[6] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 2. Ksiкga wizyt rocznych dekanatu Hiuskiego. – 1791. – Арк. [15] адг.

[7] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41248. Akta wizyty generalney surrogacyi Nowogrodzkiey Dekanatu Cyrynskiego roku 1793 sporządzone. – 1793. – Арк. [39].

[8] РДГА. – Ф. 823. – Воп. 3. – Спр. 519. – Protokoł wizyt diecezyi Mscisławskiey. Wizyta dyj. Orszańskiey odprawiona w r. 1736. – 1732–1736. – Арк. [5] адг.

[9] Там жа, арк. 9 адг.

[10] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 185. Wizyty dekanatu Smolańskiego i Orszańskiego za 1822 rok. – 1822. – арк. 84.

[11] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 50. Wizyja dekanatu Brzeskiego. – 1773. – [71] л.

[12] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. Wizyja generalna Pružańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów. – 1759. – 450 с.

[13] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41244. [Візіты цэркваў Лідскага, Мазырскага, Рэчыцкага дэканатаў]. – 1792–1803. – Арк. [87] адг.

[14] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 179. Wizyty dekanatu Bychowskiego za 1822 rok i Horodyszańskiego. – 1822. – Арк. [23-23 адг.]

[15] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 186. Akta wizyty generalney greko-unickich... cerkwiow dwoch dekanatow Ciecierzynskiego i Czereyskiego w roku 1822. – 1822. – [168] арк.

[16] НГАБ. – Ф. 136. – Воп. 1. – Спр. 41240. [Візіты Тураўскага, Убарцкага, Мазырскага, Петрыкаўскага дэканатаў Тураўскай епархii]. – 1777–1787. – [284] арк.

[17] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 179. Wizyty dekanatu Bychowskiego za 1822 rok i Horodyszańskiego. – 1822.

[18] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. Wizyja generalna Pružańskiego, Kobryńskiego, Poliskiego, Kamieneckiego y Włodawskiego dyecezyi Brzeskiey dekanatów. – 1759. – С. 118, 129, 133.

[19] НГАБ. – Ф. 1655. – Воп. 1. – Спр. 2. Akta wizyty generalney surrogacyi Mińskiey dekanatu Jhumńskiego r. 1792 sporządzono. – 1792. – Арк. [4] адг.

[20] НГАБ. – Ф. 1502. – Воп. 1. – Спр. 13. [Візіты Навагрудскага дэканата]. – 1754. – [60] арк.

[21] НГАБ. – Ф. 1299. – Воп. 1. – Спр. 1. Akt wizyty generalney surrogacyi Poleskiey dekanatu Hłuskiego. – 1792. – [31] арк.

[22] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. Wizyty dekanatów: Witebskiego, Wieliżskiego, Wielaszkowskiego, Mikulinskiego i Zadz'wińsko-Bieszenkowskiego za rok 1822. – 1822. – [224] арк.

[23] Там жа.

[24] РДГА. – Ф. 824. – Воп. 2. – Спр. 186. Akta wizyty generalney greko-unickich... cerkwiow dwoch dekanatow Ciecierzynskiego i Czereyskiego w roku 1822. – 1822. – [168] арк.

[25] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 50. Wizyja dekanatu Brzeskiego. – 1773. – арк. 30 адг.
[26] ДАЛ. – Холмская грэка-каталіцкая кансісторыя. – Сігн. 143. – С. 9–10.
[27] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410. – Арк. 118-118 адг.
[28] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. – С. 25.
[29] Там жа. – С. 33.
[30] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Спр. 1410.
[31] ЛДГА. – Ф. 634. – Воп. 1. – Спр. 48. – С. 17, 41, 57, 83.

## SUMMARY

**Halina Flikop**

**The peculiarities of terminology in describing the iconostasis in the vizitatine acts of Uniate churches in Belarus at the end of the 17$^{TH}$ - first hale of 19$^{TH}$ century**

The Peculiarities of the description of the iconostasis and the use of special terminology for their determination in the protocols of inspections Uniate churches in Belarus in the late 17 – beginning of the 19 centuries are considered. The research based on asynthesis of information from a number of historical documents that highlight the state of about 2000 Greek Catholic churches. The most interesting examples of archival sources is included in this article and in original language with preservation of those days spelling.

*Keywords:* Uniate Church, the iconostasis, the archival sources, protocols of inspections, the interiors of cathedrals, terminology